***Кавальчук Т. Л.**, загадчыца бібліятэкі гімназіі № 2 г. Ваўкавыска Гродзенскай вобласці*

# Матчынай мовы словам святым!

## Літаратурная гульня, прысвечаная творчасці Рыгора Барадуліна. III–IV класы

***Мэта:*** пазнаёміць дзяцей з цікавымі творамі знакамітага беларускага паэта Рыгора Барадуліна; прывіць цікавасць да кніг беларускіх пісьменнікаў.

**I. Арганізацыйны этап.**

— Добры дзень, паважаныя сябры. Мы сустрэліся сёння, каб правесці літаратурную гадзіну па творах вядомага беларускага пісьменніка Рыгора Барадуліна з нагоды яго дня нараджэння. Любіў паэт сваю родную мову, таму і пісаў толькі на беларускай. І так прыгожа гаворыць пра родную мову ў вершы «Азбука — вясёлы вулей», па якой сёння мы правядзём гульню. Пасля чытання твораў Рыгора Барадуліна адразу падымаецца настрой, адчуваеш сябе шчаслівым і вясёлым, яшчэ больш захапляешся і зачароўваешся прыродай роднай зямлі, ласкавым сонейкам, прыгожым краявідам, прыемным пахам чаромхі, неверагодным спевам птушак…

— Рыгор Барадулін любіў дзяцей, таму так многа для іх напісаў як казак, так і іншых твораў. Больш за ўсё паэт хацеў, каб дзеці беларускія любілі сваю родную беларускую мову. Вось, паслухайце:

Гукі мовы роднай, наскай,
Перапоўняць сэрца ласкай,
Дык шануй святыя словы
Беларускай звонкай мовы!

— Рыгор Барадулін напісаў многа твораў і пра вайну. Сваімі вершамі ён асуджаў войны і хацеў, каб паўсюль на зямлі быў мір. Балючая памяць пра апаленае вайной маленства, пра гераізм, мужнасць змагароў пранізвае творы Рыгора Барадуліна.

— Кожны чалавек з дзяцінства, з калыскі пераймае ад продкаў вялікую прывязанасць да роднай зямлі, да мясцін, дзе ён нарадзіўся і вырас. Нам нельга забываць гісторыю свайго краю. Беражыце сваю малую радзіму, ахоўвайце яе цудоўную прыроду, таму што прыгажэйшай за яе вы не знойдзеце. Менавіта да гэтага вас заклікаюць вершы Рыгора Барадуліна. Паэт перажывае, што моладзь, паехаўшы на вучобу ці на працу ў вялікія гарады Беларусі альбо замежжа, забывае сваю малую радзіму, і заклікае прыязджаць дамоў часцей:

Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою не ачарсцвець,
Каб не страціць святое штосьці.

— А цяпер распачнём конкурсную праграму. Пераможцаў чакаюць прызы.

**II. Асноўная частка.**

**Заданне 1.**

Заданне дапаможа ўспомніць дзіцячыя вершы Р. Барадуліна.

**1.** Як называлі добрых суседзяў, якія жылі побач? *(Дзядзька Дзякуй і яго суседка Каліласка.)*

**2.** Ці так трэба любіць маму, як любіць яе дзяўчынка Ната ў вершы Рыгора Барадуліна «Ната маму любіць надта!»? *(Не.)*

**3.** Па якой прычыне так ціха і павольна ідзе слон? *(Вязе ён дзіцячы сон.)*

**4.** Па якой прычыне ўсе зразумелі, што хлопчык Жора вельмі добры мастак? *(Таму што птушка жораў, якую ён намаляваў, паляцела ў неба да зораў.)*

**5.** Чаму акула прыплыла менавіта да акуліста? *(Таму што яна думала, што ён спецыяліст для акул.)*

**6.** Што больш за ўсё любіць рыжы кот з верша «Мурлыка Муляр»? *(Сала.)*

**7.** З-за чаго хлопчык роў, калі ірваў траву для каровы? *(Ён апёкся крапівой, на якую выпадкова напаў.)*

**8.** Па якой прычыне хлопчык не змог стаць матацыклістам? *(Таму што замест матацыкла ён асядлаў дзіка.)*

**9.** Што нёс матылёк для сваіх дзетак? *(Кулёк смактункоў цукерак.)*

**10.** Які сон прысніўся Хлопчыку-ўсхопчыку? *(Што ён у бабуліным гародзе павырываў замест пустазелля буракі, цыбулю, агуркі і памідоры.)*

**11.** Ці ўзрадаваўся кот, калі яму прынеслі хурмы? *(Не, ён хацеў мышку.)*

**12.** Што будзе шукаць усю зіму вясёлы снег? *(Свой смех.)*

**Заданне 2.**

Неабходна адказаць урыўкам з верша.

**1.** Што здарылася з марозам у вершы «Упартыя дзверы»? *(«А пад ранне, // Хоць крычы, // Палец ледзь не прырос // Да настылай клямкі. // Ды мароз // Быў цямкі, // Сам сабе не дараваў, // Палец як не адарваў».)*

**2.** Хто дапамог Лане многа з’есці, калі да яе прыйшоў апетыт? *(«Есці памагалі Лане: // Пліска, // Лыска, // Кот вусаты, // Голуб, // Верабей чубаты».)*

**3.** Для чаго трэба ў Нерушы правяраць расліны верасу? *(«Неруш // Свой // Радасна бяры. // Баравікамі ў кошыку // Парадуешся пошуку».)*

**4.** Для каго зварыўся смачны суп? *(«Суп зварыўся // Пстрыкі-брыкі // Для маленькай Дамінікі».)*

**5.** Што адказала мама, калі маленькі каток скардзіўся ёй, што ён самы непрыгожы, таму што верабейкі не хочуць з ім гуляць? *(«— Ты ў нас // Прыгожы, // Ну, якраз // Як цётка родная твая, // Што летась // З’ела вераб’я. // Да нашае радні // Цяпер // У вераб’ёў прапаў // Давер!».)*

**6.** Што раіць зрабіць паэт у вершы «Што трэба», каб мець мяккую падушку? *(«Трэба абскубці птушку, // Потым наскубці пер’я // Ля Жывалакі ці ля Зазер’я. // Трэба ўсё папарадку // Рабіць: // Спачатку // Насыпку пер’ем набіць».)*

**7.** Якія гукі і па якой прычыне захацела прамовіць карова? *(«Паслухала карова, // Пра што шуміць дуброва, // Падумала, чаму — // Му».)*

**8.** Што здарылася, калі акула прыйшла да акуліста? *(«Акуліст // Глядзіць на хворую // І спакойна прыгаворвае: // — Вы, няйначай, // Шмат рыбачыце // І таму вось // Кепска бачыце».)*

**9.** Каго трэба было палічыць у творы «Каб ты не змог»? *(«Вужыха з вужанятамі, // Важыха з важанятамі, // Зубрыха з зубранятамі, // Вепручыха з вепручанятамі, // Крумкачыха з крумкачанятамі, // Пугачыха з пугачанятамі».)*

**10.** Што засталося пасля таго, як сабака перайшоў праз мост? *(«Ад сабакі не адстаў, // Следам // Брэх сабакаў // Грукатаў // І якатаў, // Галасіў // І плакаў».)*

**Заданне 3.**

Трэба адгадаць загадкі.

**1.** І ўзаб’е смятанку, цеста.
Ды не пыксер,
І не мыксер,
Ён, крутун,
Завецца…

*(Міксер.)*

**2.** А яно і цёмнай ночы
Пазірае зырка ў вочы.
Асвятляе ўсё жытло…

*(Электрычнае святло.)*

**3.** Невідзімец на пліце
Сіняй кветкаю цвіце.

Корміць нас
І поіць на,
Ды не любіць жартаў…

*(Газ.)*

**4.** Ёй адкінь паціху спінку
І адкінься на хвілінку.
У памост чатырохлапа
Упіраецца…

*(Канапа.)*

**5.** Звон двухвухі на шнуры,
Падымай — гавары.
Будзіць звон
І кліча звон,
Ён завецца…

*(Тэлефон.)*

**Заданне 4.**

Удзельнікам гульні неабходна ўспомніць вершаваную казку «Мех шэрых, мех белых» і адказаць на пытанні.

**1.** Па якой прычыне мужык не мог араць сваю зямлю? *(Кабыла была худая, не магла працаваць, а зямля была цвёрдаю, была пакрытая травою.)*

**2.** Што са злосці пажадаў мужык сваёй кабылцы? *(Каб яе задраў мядзведзь.)*

**3.** Што здарылася адразу пасля яго слоў? *(З'явіўся мядзведзь, які адразу захацеў выканаць просьбу мужыка.)*

**4.** Ці аддаў мужык мядзведзю сваю старую кабылу? *(Не, ён яе пашкадаваў, але не ведаў, як яму пазбавіцца ад мядзведзя.)*

**5.** Хто мужыку дапамог абдурыць мядзведзя? *(Лісіца, але яна дамовілася з мужыком, што ён шчодра аддзячыць ёй раніцай наступнага дня.)*

**6.** Як хацела лісіца, каб мужык яе аддзячыў? *(Каб ён прынёс ёй мех шэрых і мех белых курэй.)*

**7.** Што лісіца крычала на ўсё поле? *(Што страляць будзе звяроў, у тым ліку і мядзведзя.)*

**8.** Дзе схаваўся мядзведзь ад лісіцы? *(На возе, ён прыкінуўся калодай.)*

**9.** Што сказала лісіца і тым вырашыла лёс мядзведзя? *(«Каб гэта была калода, тырчала б у ёй сякера».)*

**10.** Ці хмуры ехаў стары дадому? *(Не, таму што ён вёз цёплую мядзведжую шкуру.)*

**11.** Што прынёс мужык у мяшку, каб аддзячыць лісіцы? *(Замест курэй — шэрага сабаку і белага.)*

**12.** Ці злавілі сабакі хітрую лісіцу? *(Так, у канцы казкі гаворыцца, што бабка падмятала лісіным хвастом.)*

**Заданне 5.**

Трэба пазнаць, з якой казкі словы і чые яны.

**1.** Казлятачкі,
Белянятачкі,
Адамкніцеся,
Адапрыцеся,
Адчыніце сенцы,
Прынясла вам мамачка,
Поўна вымца малачка. *(Каза, «Бабуліна казка».)*

**2.** — Палюю,
Па лесе блукаю,
Ваўкоў, мядзведзяў страляю! *(Лісіца, «Мех шэрых, мех белых».)*

**3.** — Дзеўка-мілавіца,
Русая касіца,
Абтрасі мяне, перапалавінь,

Яблыкаў сабе вазьмі

І мне пакінь. *(Яблынька, «Залатая прасніца».)*

**4.** — Боб урадзіў,

Нам зжаць яго трэба,

Зімой не будзем ведаць бяды. *(Баба, «Бо б да неба вырас боб…».)*

**5.** — Ёсць, ёсць у дзедкі

Гладкі бычэчак,

Курка-рабушка,

Сучка-брахушка,

Бабка-сварушка. *(Калядоўшчык, «Як воўк калядаваў».)*

**6.** — Тваю бяду

Я лапай развяду,

Распраўлюся

Я ў момант з ненажэраю. *(Лісіца, «Мех шэрых, мех белых».)*

**Заданне 6.**

Неабходна намаляваць малюнак да казкі «Як воўк калядаваў».

Вучні малююць, а журы ацэньвае іх малюнкі, за лепшы малюнак даецца прыз.

**Заданне 7.**

Трэба па ўрыўку пазнаць казку.

**1.** Чакаюць мамку сіроткі,

Не адчыняюць дзверы.

Казалі пляткаркі-сарокі,

Зноў ходзіць

Воўк-ненажэра. *(«Бабуліна казка».)*

**2.** Прасці бабіна дачка села,

А верацяно фур дый паляцела.

Пабегла за верацяном услед

Далёка-далёка,

Аж на той свет. *(«Залатая прасніца».)*

**3.** Уранку,

З-за суседняга ляска

Ледзь толькі сонца

Паказала вуха,

Лісіца ўжо чакала мужыка,

Аблізвалася загадзя ласуха. *(«Мех шэрых, мех белых».)*

**4.** Як учулі голас тонкі,

Паскакалі наабгонкі,

Без агля́дкі.

Адчыніліся –

Памыліліся

Казляняткі. *(«Бабуліна казка».)*

**5.** Ніколі клопат не мае жалю.

І лезлі яны па стручках.

Пакрыху

Ламалі стручкі

Ды ў пучкі вязалі

І ў хату кідалі праз страху. *(«Бо б да неба вырас боб…».)*

**Заданне 8.**

Неабходна па ўрыўку пазнаць верш.

**1.** Цётка шчотка,

Дзядзька венік

З’елі ўранні

Пень апенек. («Ад снядання да вячэры».)

**2.** Цёмна ў хаце.

Цёмны двор.

Уздыхае дзед Рыгор.
Ані плачу,
Ані крыку,
Дружна ўсе
Шукаюць Ніку. *(«Дома — Ніка — Дамініка».)*

**3.** У Індыі, у Індыі
Па вуліцах Калькуты
Слон даўганосы
Шлындае —
Разуты,
Непадкуты. *(«Як сон не разбудзіць?».)*

**4.** Дома маме
Памагаць —
Не рукамі
Памахаць. *(«Дапамога».)*

**5.** Мінулі станцый шмат,
Бо вёз дзіцячы сад
З экскурсіі цягнік —
Нястомны працаўнік. *(«Вясёлы цягнік».)*

**6.** Думаў заяц
Ноч і дзень,
Як уласны
Зважыць цень. *(«Колькі важыць зайцаў цень?».)*

**Заданне 9.**

Трэба адгадаць загадкі.

**1.** Не спачне ні на хвілінку,
І з галінкі на галінку
Пышнахвоста

Скача зорка.
Зорка гэтая…

*(Вавёрка.)*

**2.** І не сляпы, і не глухі
Наняўся шэры ў пастухі.
Так пасвіў статак,
Што ад статку
Не засталося і астатку.

*(Воўк.)*

**3.** Яна хвастом
Сюды-туды —
І замяце свае сляды.
І калі спіць,
Ёй курка сніцца.
Майстрыца ашукаць…

*(Лісіца.)*

**4.** Смокча лапу,
Быццам соску.
Сніцца пасека яму
І дарога з лесу ў вёску,
Па якой са шкоды ледзь
Ад сабак уцёк…

*(Мядзведзь.)*

**5.** Дрыжыць пад кустом
З кароткім хвастом.
І калі бяжыць,
І тады дрыжыць.

*(Заяц.)*

**Заданне 10.**

Разгадайце крыжаванку па творах Р. Барадуліна.

**1.** Верш, у якім Р. Барадулін нагадвае пра Чарнобыльскую трагедыю і пра тое, колькі беларусы з-за гэтага выплакалі слёз.

**2.** У якім вершы Р. Барадулін расказвае пра свята, калі трэба ноччу шукаць Папараць-кветку?

**3.** Верш аб тым, як бацька паэта плаціў зімой і вясной сумленна аброк.

**4.** Назва верша, у якім паэт трывожыцца, каб гаспадар не аддаў вясной шапку на гняздо вароне.

**5.** У гэтым вершы Р. Барадулін успамінае працу за ўвесь года, а яшчэ пра поле і лес.

**6.** У гэтым вершы жанчына, у якой памёр муж, вельмі спадзяецца на цялушку, якую яна купіла, каб пракарміць сваіх дзяцей.

**7.** У гэтым вершы Р. Барадулін параўноўвае нашу краіну з адзічэлай яблыняй, якую ўсе трасуць, калі праходзяць каля яе.

**8.** Верш Р. Барадуліна пра Сафійскі сабор, які ласкава называюць людзі «Сафійка».

**9.** Назва паэмы Р. Барадуліна пра яго маці.

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | | Б | | | |
| | 2 | | | А | | | |
| | | 3 | | Р | | | |
| 4 | | | | А | | | |
| | | 5 | | Д | | | |
| | 6 | | | У | | | |
| | | 7 | | Л | | | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | **8** | | | І | | | |
| **9** | | | | Н | | | |

*Адказы:* **1** — Набела; **2** — Купалле; **3** — Аброк; **4** — Шапка; **5** — Год; **6** — Цялушка; **7** — Яблыня; **8** — Сафійка; **9** — Куліна.

**Заданне 11.**

Конкурс на лепшае чытанне жартаўлівых вершаў Рыгора Барадуліна.

***Чытач 1:*** Хлопчык-усхопчык
Рана ўсхапіўся,
Хлопчык-усхопчык
За працу ўхапіўся.
Ён дапамог
У гародзе бабулі
Вызваліць лехі
Ад лютай цыбулі,
Ад буракоў,
Ад гуркоў,
Памідораў —
Ён паказаў ім
І спрыт свой,
І нораў.
Лехі бабуліны
Аж палыселі,
І забуяла
Адно пустазелле.
Хлопчык-усхопчык
Уночы ўсхапіўся,
Сон яму з вечара

Сніўся і сніўся,
Як дапамог
У гародзе бабулі
Вызваліць лехі
Ад лютай цыбулі,
Як паспрыяў ён
Гуркам,
Памідорам.

***Чытач 2:*** Берагам ішоў Цімошак,
Нёс цяжкі лазовы кошык.
Варушыўся дужа кошык —
Там сядзела многа кошак.
Адпачыць схацеў Цімошак,
Задрамаў —
Раскрыўся кошык.
Кошкі хітрыя паволі
Разбрыліся ўсе па волі.
Кошка першая пайшла
Частавацца да бусла.
Пачастунак надта слабы —
Не да смаку кошцы жабы.

**III. Падвядзенне вынікаў.**

— Вось бачыце, якія смешныя і цікавыя вершы Рыгора Барадуліна. А тыя вучні, якія сталі пераможцамі, атрымоўваюць салодкія прызы. Абавязкова схадзіце ў бібліятэку і адкрыйце зборнік «Ішоў коця па канапе». На жаль, вядомага паэта сёння няма сярод жывых. Рыгор Барадулін памёр 2 сакавіка

2014 года. Паэт пакінуў нам у спадчыну цудоўныя творы, якія сёння вывучаюцца па школьнай праграме ва ўсіх адукацыйных установах.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Барадулін, Р.* Ішоў коця па канапе : вершы, загадкі і адгадкі, казкі-перкакзкі / Р. Барадулін. — Мінск : Полымя, 1997. — 271с.

2. *Барадулін, Р.* Слаўлю чысты абрус : выбранае/ Р. Барадулін. — Мінск : Беларусь, 1996. — 271с.